# Работа з прыроднымі матэрыяламі
# Частка 6

Сячкоўская Лідзія Рыгораўна,

старшы выкладчык кафедры спецыяльнай педагогікі

# ПЛАН ЗАНЯТКАЎ

1. Дадатковыя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні вырабаў з прыродных матэрыялаў
2. Інструменты для выканання вырабаў з прыродных матэрыялаў
3. Асобныя пытанні бяспекі працы пры выкананні вырабаў з прыродных матэрыялаў

# Дадатковыя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні вырабаў з прыродных матэрыялаў

- **Гліна** (рознага колеру: белая, жоўтая, чырвоная, блакітная, зялёная...) - для лепкі дробных і буйных (на каркасе) фігурак
- **Пластылін -** для змацавання частак вырабаў і для лепкі некаторых асобных дэталяў
- **Дрот** (цвёрды і мякк і, рознай таўшчыні, з хлорвінілавай ізаляцыяй рознай расфарбоўкі) - для выканання асобных дэталяў вырабаў (шыя, канечнасці, вочы), для змацавання частак цацак
- **Пенапласт -** у якасці падстаўкі, для выканання падабенства снегу
- **Арганічнае шкло -** для імітацыі снегу, празрыстай вады
- **Фальга** (тонкія металічныя лісты з каляровых металаў або сплаваў-свінцу, волава, алюмінія) - для ўпрыгожвання вырабаў
- **Каляровая папера** (розных відаў, якія адрозніваюцца па таўшчыні, шчыльнасці, афарбоўцы, прызначэнні) - для выканання асобных дэталяў вырабаў

# Дадатковыя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні вырабаў з прыродных матэрыялаў

- **Фарбы** - падыходзяць гуашавыя, бо яны яркія, густыя і добра трымаюцца на размаляванай паверхні
- **Каляровыя ніткі** - розныя па прызначэнні і па выглядзе сыравіны, для стварэння асобных дэталяў, мацавання частак, ўпрыгожвання вырабаў
- **Каляровыя ласкуты** (абрэзкі розных тканін) – для афармлення вырабаў
- **Фанера** - у якасці падстаўкі, для выразання лобзікам асобных фігур
- **Клей** розных марак - для склейвання дэталяў у вырабах, для апрацоўкі матэрыялаў, прызначаных на доўгае захоўванне (каб не было дэфармацыі і псавання падчас іх высыхання)
- **Лак** (бескаляровы масляны, або нітралак) - для падкрэслення натуральнай прыгажосці прыроднага матэрыялу– надання трываласці вырабам
- **Скура, лямец, фетр** - для афармлення вырабаў
- **Гардзінна-цюлевыя тканіны** - для афармлення вырабаў
- **Тасьма, шнур, плецены вырабы** - для афармлення вырабаў

# Інструменты для выканання вырабаў з прыродных матэрыялаў

- **Лобзік** (звычайны) з наборам пілак. Пілкі павінны быць самыя тонкія №1 і №2, для працы па дрэве і метале
- **Нажніцы** - невялікія, з тупымі канцамі
- **Сцізорык** - павінен быць з вострым канцом, неабходным для праразання адтулін у цвёрдай абалонцы арэхаў і жалудоў. Сцізорык можна замяніць востраканечным медыцынскім скальпелем
- **Пінцэт** - для ўтрымання матэрыялу невялікіх памераў
- **Абцужкі** для закручвання дроту пры вырабе вырабаў
- **Кусачкі** - невялікага памеру
- **Нажоўка** (павінна быць маленькай і з дробным зубам). Можна выкарыстоўваць маленькую нажоўку па металу
- **Шыла** - даўжыня колючай часткі 4-5 см, дыяметр 1,5 - 2 мм, з трывалага металу. Даўжыня ручкі 5 – 7 см
- **Абцугі** - павінны быць лёгкія і маленькія

# Інструменты для выканання вырабаў з прыродных матэрыялаў

- **Ручныя ювелірныя цісочкі** з наборам свердзелаў дыяметрам ад 1 да 4 мм
- **Свердзел** (выкарыстоўваецца, калі цяжка зрабіць адтуліны шылам). Для заціску і ўтрымання свердзела падчас працы выкарыстоўваюцца ручныя ювелірныя цісочкі
- **Маленькі малаточак**
- **Іголка** буйная швейная
- **Стэкі** даўжынёй 10-12 см рознай формы. Для апрацоўкі паверхні з гліны і пластыліну

**Абсталяванне працоўнага месца**:

- **Спецыяльная фанерная дошка** памерам 200х300 мм - для абароны сталоў і парт ад пашкоджанняў пры рэзанні і свідраванні адтулін у прыродных матэрыялах
- **Асабістая** фанерная або трывалая кардонная **скрынка** для захоўвання інструментаў і недаробленых работ (з этыкеткай, якая паказвае прозвішча і імя ўладальніка)

# Асобныя пытанні бяспекі працы пры выкананні вырабаў з прыродных матэрыялаў

- Колючы, рэжучы інструмент падчас працы павінен быць накіраваны ад сябе, каб у выпадку саслізгвання з апрацоўванага матэрыялу не параніць працуючага. Рукі пры гэтым павінны абапірацца на працоўную дошку (стол), а не знаходзіцца на вазе
- Нож ці скальпель неабходна трымаць у руках моцна. Кірунак габлёўкі павінен быць «ад сябе». Канец палачкі або аловак, які вострыцца, павінен ўпірацца ў працоўную дошку
- Для праразання адтулін у жалудах, каштанах, арэхах, каб пазбегнуць траўмы ў выпадку саслізгвання нажа з глянцавай паверхні, прыродны матэрыял варта ўтрымліваць з дапамогай прыстасаванняў (зацiснутым з двух бакоў). Нож трэба трымаць шчыльна пальцамі правай рукі, упіраючыся мезенцам ў працоўную дошку. Калі не выкарыстоўваць прыстасаванняў, то апрацоўваемы матэрыял варта трымаць у левай руцэ, абапіраючыся ёю на працоўную паверхню

# Асобныя пытанні бяспекі працы пры выкананні вырабаў з прыродных матэрыялаў

- Пры свідраванні адтулін у матэрыяле, цісочкі трэба трымаць у правай руцэ, пачынаць свідраванне з невялікага націску, паступова ўзмацняючы яго па меры паглыблення свердзела
- Пры працы шылам не варта ўжываць залішніх намаганняў, каб не праткнуць жолуд (каштан...) і не параніцца
- Іголку варта захоўваць у ігольніцы з прадзетай ніткай, падчас працы класці на асобную сурвэтку
- Нажніцы варта ўжываць з закругленымі канцамі, каб выпадкова не параніцца. Кольцы нажніц павінны адпавядаць памеру дзіцячай рукі
- З усімі колючымі і рэжучымі інструментамі працаваць толькі на сваім працоўным месцы
- Выкарыстоўваць толькі спраўны, прыдатны інструмент для працы

# Літаратура

1. Журба, А. Ф. Трудовое обучение в 1 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения/А. Ф. Журба, Н. А. Юрченко. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. –168 с.
2. Журба, А. Ф. Трудовое обучение во 2 классе : учеб.-метод. пособие для учителей общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения / А. Ф. Журба, Н. А. Юрченко. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2011. – 176 с.
3. Журба, А. Ф. Трудовое обучение в 3 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений. общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения /А. Ф. Журба, Н. А. Юрченко. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2013. – 151 с.
4. Журба, А. Ф. Трудовое обучение в 4 классе : учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения /А. Ф. Журба, Н. А. Юрченко. – 2-е изд., испр. – Минск : Нац. ин-т образования, 2015. – 149 с.
5. Новикова, Е. Ф. Творчество в соавторстве с природой /Е. Ф. Новикова. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2016. – 176 с.
6. Филенко, Ф.П. Поделки из природных материалов: Пособие для учителей нач. классов по внеклассной работе/Ф.П.Филенко. – М.: Просвещение, 1976. – 112с. с ил.